3. Руска-беларускі слоўнік / Пад рэд. А. Александровіча. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1937.
4. Русско-белорусский словарь: В 2 т. / Ред. К. К. Атрахович. 2-е изд., доп. и пераб. Мн.: Белорус. Сов. Энцикл., 1982.
5. Русско-белорусский словарь: В 3 т. / АН Беларуси, Ин-т Языкознания Я. Коласа, 4-е изд., испр. и доп. Мн.: БелЭН, 1993.
6. Русско-белорусский словарь / Под ред. Я. Коласа, К. Крапивы. М.: Изд-во иностр. и национ. словарей, 1953.
7. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / Пад. рэд. М. В. Бірылы. Мн.: БелСЭ імя П. Броўкі, 1987.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / Пад. рэд. К. К. Атраховіча. Мн.: БелСЭ, 1977–1984.

# ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ ПОШУКІ В. БЫКАВА 90-х гг. (АД АПАВЯДАННЯ ДА ПРЫПАВЕСЦІ)

**Р. Ю. Дубашынскі**

У сучаснай сусветнай літаратуры цэнтральнае месца займаюць пераважна малыя жанравыя формы. Развіццё літаратурнага працэсу ў кірунку ад вялікіх форм да малых можна назваць заканамерным.

Васіль Быкаў пачынаў свой творчы шлях з апавяданняў. Пераход да аповесці, якая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў заставалася дамінантным жанрам быкаўскай творчасці, тлумачыцца імкненнем пісьменніка як мага больш дэталізавана раскрыць тую ці іншую галоўную тэму і праблему. У 90-я гг. ён зноў аддае перавагу жанру апавядання. Мажліва, таму, што малая форма, у адрозненне ад вялі-кай, як слушна зазначае М. Чудакова, дазваляе творцу сказаць больш. Ды і схільнасць да філасофскага асэнсавання праблем рэчаіснасці, мінулага, сучаснага і будучага накіроўвае пісьменніка ў накірунку да кананічных форм. В. Быкаў на новым этапе творчасці робіць крок на новую прыступку – пераходзіць на ўзровень філасофскіх універсалій.

Ідэйна-мастацкая эвалюцыя В. Быкава 90-х гг. ад апавядання да прыпавесці ажыццяўлялася праз жанр аповесці. Па аб'ёме яго сучас-ныя аповесці значна меншыя за ранейшыя, што таксама пацвярджае схільнасць пісьменніка да малой формы. У творы «Пакахай мяне, салдацік» у чарговы раз паказана жорсткае аблічча вайны. Гэтай жа тэме прысвечаны апавяданні «Палітрук Каламіец» і «Палкаводзец».

Пра змрочныя часы таталітарызму В. Быкаў пісаў у савецкія часы («Мёртвым не баліць»). Апавяданне «Жоўты пясочак» пра рэпрэсіі 30-х гг. падаецца вышэйшым пунктам у даследаванні творцам дзейнасці сістэмы па вышукванні ворагаў народа. Пісьменніка цікавіць сама сутнасць з'явы, якую прынята называць сталінізмам. Да ворагаў залічвалі не толькі людзей кшталту паэта Фелікса Грома ці селяніна Аўтуха, але і

саміх чэкістаў. Сурвіла, які працаваў у след-чым аддзеле, усё рабіў згодна з канонамі рэпрэсіўнай сістэмы, не думаў, што можа лёгка апынуцца ў адной яміне з тымі, каго калісьці мардаваў і забіваў. Але перад самай смерцю з вуснаў Сурвілы злятаюць ужо словы пратэсту і праўды.

Праблема замбаванасці паўстае і з апавядання «Зенітчыца». Пры выхадзе з акружэння гераіня твора Ніна Башмакова на просьбу камбата Калашнікава прастрэліць яму руку глядзіць праз прызму савецкага патрыятызму, адмысловага ў сваёй рэалізацыі. Таму яна і забівае камбата, не зважаючы на каханне да яго. Пра франтавое каханне ідзе гаворка і ў апавяданні «Кароткая песня». Сітуацыя вельмі падобная да той, што мы назіралі ў «Зенітчыцы». Камандзір Федзя і санінструктарка Зіна кахаюць адно аднаго. Але іх напаткала бяда: абое трапілі ў палон. Паліцаі везлі іх здаваць немцам. На просьбу Фёдара адпусціць дзяўчыну, галоўны паліцай адказвае, што зробіць тое толькі «за нежны пацалуй». Здарылася «паскуднае і страшнае» – забойства, але забойства не фізічнае, а маральнае. «Нават у д’ябальскіх варунках вайны жыццё ўсё ж даражэй за каханне. Можа, таму, што жыццё на вайне набывае адмысловы кошт. Жыць без кахання магчыма, а мёртваму ўжо не кахаць. А ўвогуле, і так, і так кепска...» [1; с. 22]. У гэтых словах – увесь Быкаў, для якога не існуе пэўна вызначанай «залатой сярэдзіны».

Гаворачы пра ўвасабленне філасофіі экзістэнцыялізму ў творчасці В. Быкава, узнікае пытанне, якога роду гэты экзістэнцыялізм: стыхійны ці свядомы. Асноўныя модусы быцця ў экзістэнцыялізме – закінутасць, страх, трывога, прыгнечанасць, клопат, згрызоты сумлення – у большай ці меншай ступені праяўляюцца абсалютна ва ўсіх творах пісьменніка. Па творчасці апошняга часу можна меркаваць, што экзістэнцыялізм у В. Быкава усё ж не стыхійная з’ява. Гэта і не наследаванне Ж.-П. Сартру і А. Камю, хоць творца, вядома, быў знаёмы з іх тэарэтычнымі распрацоўкамі. У апавяданні «Пагорак» мы сустракаемся з такой катэгорыя экзістэнцыялізму, як свабодны выбар. Чалавеку трэба зрабіць выбар, вынік якога яму не дадзена ведаць. Як заўважае Е. Лявонава, «спраўляе баль яго вялікасць выпадак» [2; с. 25]. Капітан Лемеш, атрымаўшы даволі выгоднае накіраванне ў стралковы батальён, спыніўся перад выбарам, якім шляхам паехаць: па лагчыне ці праз пагорак. Выбраў другое, не ведаючы, што там праз імгненне абарвецца яго жыццё. Дарэчы, менавіта пагорак быў месцам гібелі аўтаматчыкаў з апавядання «Кацюша», на пагорку расстрэльваюць вязняў у «Жоўтым пясочку», на пагорку выконваецца прыгавор вайсковага трыбуналу ў «Палкаводцы». Можна сцвярджаць, што гэты вобраз-локус у творчасці пісьменніка набывае сімвалічнае значэнне, становіцца ўвасабленнем бездапаможнасці чалавека перад тварам смерці, трагічнай наканаванасці яго лёсу (таксама адзнака экзістэн-цыялізму).

В. Быкаў звяртаецца і да асэнсавання іншых трагічных старонак нашага мінулага, прычым у рэчышчы экзістэнцыялізму. Неабход-насць рабіць выбар у выключным драматычна-трагічным становішчы назіраем у апавяданні «На чорных лядах». Падзеі ў творы разгорт-ваюцца тады, калі выбар слуцкімі паўстанцамі ўжо зроблены. Памерці дзеля жыцця родных і блізкіх. Памерці не ад варожай кулі, а сваёй уласнай рукой паставіць апошнюю кропку. І «рытуал» самазні-шчэння здзяйсняюць усе, акрамя пятнаццацігадовага Валодзькі Сулашчыка. «Камандзір колькі ні думаў, ніяк не мог пагадзіцца з пагібеллю» хлопчыка. «І не ведаў, што можна прыдумаць, як схіт-рыць, каб неяк зберагчы ягонае жыццё» [3; с. 273]. Але хітраваць не давялося. У барабане рэвальвера не хапала аднаго патрона.

Экзістэнцыялізм яскрава характарызуе такая катэгорыя, як абсурд, які праяўляецца ў творы, хоць, можа, і не так выразна. Але калі ёсць абсурд, павінен быць і не-абсурд. Адзіны не-абсурд у экзістэнцыялізме – гэта сумленнасць чалавека перад самім сабой, турботы, клопат пра любога чалавека, што мы і бачым у апавяданнях «На чорных лядах» і «Кароткая песня».

Недзе з другой паловы 90-х гг. В. Быкаў часцей звяртаецца да праблем сучаснасці. Аднак пераход гэты адбываецца са зменай формы адлюстравання ідэйнага боку твораў: яна паступова пачынае набываць алегорыка-сімвалічную абалонку. Апавяданне «Труба» пабудавана на прынцыпах экзістэнцыялізму. Пісьменнік «заганяе» свайго героя ў пастку, які мусіць там «дзейнічаць без надзеі на поспех» [4; с. 506]. Праз асабістыя думкі Валеры Сарокіна (апавяданне літаральна прасякнута няўласна-простай мовай) абмаляваны агульны стан не толькі савецкай рэчаіснасці, але і сучаснай. Свабодны выбар у яго сітуацыі з'яўляецца абсурдным сам па сабе. Але як гэта ні парадаксальна, менавіта ў трубе ён адчуў сябе сапраўды свабодным. Нарэшце, выбар Валера ўсё ж робіць – «нікуды адсюль больш не ісці. Не лезці, не караскацца» [5; с. 28] (як было дагэтуль, калі яго дзеянні адпавядалі эпіграфу сталага экзістэн-цыялізму, сфармуляванаму А. Камю, паводле якога чалавек, калі ён чалавек, павінен шукаць выйсце).

Кніга прыпавесцей В. Быкава «Пахаджане» – рэакцыя пісьменніка на сучаснасць і яе праблемы. У той жа час яго думка скіравана на асэнсаванне пытанняў фундаментальных, што маюць універсальнае гучанне. Пісьменнік аддаў перавагу прыпавесці з яе алегорыямі, сімваламі, за якімі схаваны глыбокі сэнс, крыецца Ісціна.

Галоўнымі складнікамі жанру прыпавесці з'яўляюцца алегарыч-насць і павучальнасць. Часам яна можа суправаджацца мараллю. Гэтым прыпавесць блізкая да байкі. Аднак, у адрозненне ад апошняй, ідэйны

бок у прыпавесці выяўляецца не ў тэксце, а ў падтэксце. У байцы чытач успрымае ідэю пасіўна, у прыпавесці – актыўна.

Важным падаецца разляд прыпавесцей праз прызму канцэптаў, якія тут варта ўспрымаць як філасофскія універсаліі. Канцэптамі «Радзіма», «Нацыя» прасякнуты ўсе без выключэння творы слыннага майстра слова. У цэнтр прыпавесці, якая дала назву ўсёй кнізе, пакла-дзена канцэптуальная схема «Радзіма» – «Дарога» – «Правадыр». Дарогу адолее той, хто ідзе. З гэтым не выпадае спрачацца. Але варта памятаць, што шлях да высокай мэты ніколі не бывае лёгкім. І галоўная задача – пераадолець усе перашкоды, прайсці праз выпрабаванні. І яшчэ – дзейнічаць у згодзе. Толькі ў згодзе, у непарыўнай лучнасці з прагаю, жаданнем здабываюцца вялікія перамогі.

У прыпавесці «Насарогі ідуць» мы маем справу з канцэптам «Незалежнасць», да якога непасрэдна прымыкае супрацьпастаўленне «Свае»–«Чужыя». Прынцып «Свае»–«Чужыя» падзяляе сем'і – нас і нашых суседзяў, роды і кланы больш архаічных грамадстваў, веравызнанні, расы і г. д. І ўжо цалкам канцэптуальна і канцэпту-алізавана ён адрознівае «свой народ» ад «не свайго», «іншага», «чужога».

Такім чынам, В. Быкаў імкнецца, з аднаго боку, да універсальнасці зместу, з другога – да лаканічнасці, выразнай адшліфаванасці малых празаічных форм і вербальнага матэрыялу. Гэта дазволіла пісьменніку тварыць у злітным суладдзі формы і зместу, напаўняючы апавяданні і прыпавесці незвычайнай моцы псіхалагізмам, жывой філасофіяй быцця. Малыя празаічныя формы В. Быкава змяшчаюць філасофскія універсаліі. У пераліку іх – канцэпты «Радзіма», «На-род», «Мова», «Свае–Чужыя», «Змаганне», «Правадыр», «Воля», «Пастка», «Аптымізм–Песімізм» і інш. Гэта «вечныя» тэмы жыцця народаў, тэмы, якія ў кожную эпоху набываюць вырашэнне на новым жыццёвым матэрыяле.

Думаецца, усё вышэй сказанае дазваляе лічыць В. Быкава буйнейшым пісьменнікам-філосафам XX ст. у маштабах не толькі Беларусі, але і ўсяго свету.

**Літаратура**

1. *Быкаў В*. Кароткая песня // Полымя. 2002. № 1.
2. *Лявонава Е*. Творчасць Васіля Быкава і Жана Поля Сартра праз прызму традыцыі Дастаеўскага: філасофска-эстэтычныя перасячэнні // Роднае слова. 2000. № 2.
3. *Быкаў В*. Збор твораў: У 6 т. Т. 6. Мн.: Маст. літ. 1994.
4. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В. М. Кожев-никова, П. А. Николаева. М.: Сов. энциклопедия. 1987.
5. *Быкаў В*. Труба // Полымя. 1998. № 9.